УДК 930.2(476)

# ОСНОВНЫЕ ПОВЕСТВОВАТЕЛЬНЫЕ ИСТОЧНИКИ ПО ИСТОРИИ ВНЕШНЕЙ ПОЛИТИКИ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО ПЕРИОДА КОНЦА XIV – СЕРЕДИНЫ XVI В.

# АСНОЎНЫЯ АПАВЯДАЛЬНЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПЕРЫЯДУ КАНЦА XIV – СЯРЭДЗІНЫ XVI СТ.

# THE MAIN NARRATIVE SOURCES ON HISTORY OF FOREIGN POLICY OF GRAND DUCHY OF LITHUANIA OF THE PERIOD AT THE END XIV – THE MIDDLE OF THE XVI CENTURY.

Л.В. Николаева/ Л.В. Мікалаева/ L. Mikalayeva

УО “БГУИР”, г. Минск/ УА “БДУІР”, г. Мінск/ BSUIR, Minsk

В статье рассматривается специфика повествовательных источников по истории внешней политики Великого Княжества Литовского в конце XIV – середине XVI в. Делается вывод о том, что при исследовании внешнеполитической проблематики есть возможность использовать большое количество разнообразных повествовательных источников, которые раскрывают содержание и сущность основных направлений внешней политики ВКЛ, а также характеризуют механизм внешнеполитической деятельности.

У артыкуле разглядаецца спецыфіка апавядальных крыніц па гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст. Робіцца выснова аб тым, што пры распрацоўцы знешнепалітычнай праблематыкі ёсць магчымасць выкарыстаць вялікую колькасць разнастайных апавядальных крыніц, якія раскрываюць змест і сутнасць асноўных кірункаў знешняй палітыкі ВКЛ, а таксама характарызуюць механізм знешнепалітычнай дзейнасці.

The article deals with the specifics of narrative sources on the history of the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania in the end of XIV – in the middle of the XVI century. It is concluded that at research of foreign policy issues there is a

Библиотека БГУИР

possibility to use a wide variety of narrative sources that reveal the content and nature of the main directions of foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania and characterize the mechanism of foreign policy.

Ключевые слова: источники; внешняя политика; Великое Княжество Литовское; исследование; классификация.

Ключавыя словы: крыніцы; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае; даследаванне; класіфікацыя.

Keywords: sources; foreign policy; the Grand Duchy of Lithuania; a study; classification.

У ліку апублікаваных крыніц, якія могуць быць выкарстаныя пры даследаванні праблем знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) канца XIV – першай паловы XVI ст., немалаважную ролю маюць апавядальныя гістарычныя крыніцы. Сярод іх найбольш важкае месца займаюць гістарыка-літаратурныя аповяды з пагадовай формай выкладання матэрыялу – летапісы і хронікі, якія адрозніваюцца значнай дэталёвасцю апісання падзей. Разам з тым, у апавядальных крыніцах нярэдка сустракаюцца фактычныя недакладнасці, а часам і наўмыснае скажэнне падзей, аднабокія меркаванні і адзнакі [1, с. 3 – 4], што надае гэтым крыніцам пэўны элемент суб’ектыўнасці, які трэба ўлічваць у ходзе працы з імі.

Даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што адметнай рысай летапісання на беларускіх землях у XV – XVI стст., па меншай меры да канца XV ст., з’яўляўся яго агульнадзяржаўны (агульнарускі) характар, імкненне вывесці гісторыю ВКЛ, асабліва славянскай часткі яго зямель, ад Старажытнарускай дзяржавы. Дадзеная з’ява непасрэдна была звязана з першапачатковымі поспехамі вялікіх князёў літоўскіх у ажыццяўленні “агульнарускай” палітыкі па збіранні так званых “рускіх” зямель. Гэта тлумачыла і назву “літоўска-рускія летапісы” [2, с. 87]. У наш час больш пашырана прапанаванае ў свой час М. М. Улашчыкам і стаўшае энцыклапедычным найменне “беларуска-літоўскія летапісы” [3, с. 385; 4, с. 192]. Апошнім часам з’явілася тэндэнцыя да ўвядзення назвы “беларускія летапісы” [5, с. 192 – 193].

Библиотека БГУИР

Летапісы і хронікі, створаныя на беларускіх землях у XV – XVI стст., захаваліся больш чым у 20 спісах (каля 22). Даследчыкамі былі прапанаваны некалькі іх класіфікацый. У залежнасці ад памераў тэксту летапісаў іх прапаноўвалася падзяляць на кароткія і падрабязныя. Адпаведна з другім пунктам гледжання, выдзяляюцца тры рэдакцыі беларуска-літоўскіх летапісаў: кароткая, пашыраная і поўная [2, с. 91]. У наш час большасць даследчыкаў пагаджаюцца з канцэпцыяй беларускага вучонага В. Чамярыцкага, які абгрунтаваў існаванне трох асобных летапісных зводаў, першыя два з якіх дайшлі да нас у складзе некалькіх спісаў. Згодна з яго меркаваннем, першы беларуска-літоўскі летапісны звод быў складзены каля 1428 – 1430 гг. у Смаленску. У яго аснову была пакладзена першая арыгінальная спроба кароткай гісторыі беларускіх і літоўскіх зямель – “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”, а таксама і маскоўскі летапіс мітрапаліта Фоція, пакладзены ў аснову агульнай часткі Беларуска-літоўскага летапісу 1446 г., што былі пазней дапоўненыя гістарычнымі запісамі да 1446 г. уключна [5, с. 192]. Асновай другога беларуска-літоўскага летапіснага зводу стала “Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага”, створаная ў 1520-я гг. Адным з адрозненняў трэцяга беларуска-літоўскага летапіснага зводу з’яўляецца тое, што ён захаваўся толькі ў адзіным спісе, вядомым под назвай “Хроніка Быхаўца” [5, с. 192 – 193]. Датыроўка гэтага помніка па-ранейшаму застаецца прадметам дыскусіі, найбольш верагодная – 60-я гг. XVI ст. [2, с. 91].

Беларуска-літоўскія летапісы утрымліваюць багаты матэрыял па гісторыі розных сфер жыцця грамадства беларускіх зямель канца XIV – першай паловы XVI ст., у тым ліку гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ. Яны асвятляюць стасункі ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім, у тым ліку ход ліцвінска-маскоўскіх і маскоўска-ліцвінскіх войн XIV – XVI стст., даюць інфармацыю аб ўзаемаадносінах ВКЛ з Перакопскай, Вялікай (Заволжскай), Нагайскай Ордамі, Польшчай, Малдавіяй, Лівонскім і Тэўтонскім Ордэнамі, Ноўгарадам і Псковам у перыяд іх самастойнага існавання. Пачынаючы з другога летапіснага звода, у беларуска-літоўскіх летапісах рабіліся спробы абгрунтавання і падкрэслівання

Бібліятэка БГУИР

асобнай ад Вялікага Княства Маскоўскага гісторыі ВКЛ, а таксама яе своеасаблівай вестэрнізацыі. Гэта быў своеасаблівы адказ на спробы знешнепалітычных праціўнікаў паставіць пад сумненне легітымнасць правячай у ВКЛ дынастыі Гедымінавічаў, а пазней яе адгалінавання – Ягелонаў, і дзейсны сродак пазбавіць і маскоўскі, і польскі бакі аргумента для абгрунтавання сваіх прэтэнзій на землі ВКЛ. Разам з тым, беларуска-літоўскія летапісы даюць магчымасць паглядзець на вывучаемыя знешнепалітычныя падзеі з ліцвінскага патрыятычнага пункту гледжання.

Палітычная гісторыя ВКЛ трапляла і на старонкі твораў польскіх гісторыкаў XV – XVI стст. Срод іх трэба вылучыць “Гісторыю Польшчы” Яна Длугаша, напісаную ў 12 кнігах у 1455 – 1480 гг. З іх кнігі 10 – 12 ахопліваюць гісторыю эпохі кіравання ў Польшчы і ВКЛ дынастыі Ягелонаў. Праца Я. Длугаша з’яўляецца ўнікальнай крыніцай гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ, утрымлівае інфармацыю аб ваенных і дыпламатычных узаемадачыненнях з татарамі, Тэўтонскім і Лівонскім Ордэнамі, Вялікім Княствам Маскоўскім, Польшай, Малдаўскім Княствам [6, с. 591 – 592]. Для Я. Длугаша характэрна негатыўнае стаўленне да самастойнасці ВКЛ. Галоўнае для яго – гісторыя Польшчы, якую ён разглядае як праслаўленне сваёй радзімы і прыклад служэння дзяржавы каталіцкай царкве і яе задачам. Працы ўласціва пэўная тэндэнцыйнасць, калі Я. Длугаш дзеля доказу сваіх тэзісаў то падганяў факты пад уласныя схемы, то скажаў звесткі крыніц, часам да супрацьлеглага. Ён некрытычна ставіўся да храналогіі, у выніку чаго адна падзея, зафіксаваная рознымі крыніцамі пад рознымі гадамі, ці нават у адной крыніцы двойчы, ператваралася ў яго працы ў два асобныя факты. З другога боку, у сваім імкненні да падрабязнасці звестак Я. Длугаш часта дадаваў да інфармацыі крыніц цэлы шэраг новых падрабязнасцей, імен, лічбаў, падзей, кіруючыся толькі сваімі здагадкамі. Аднак гэтыя недахопы не змяншаюць велізарнага значэння яго працы, як найбольш значнага помніка польскай сярэднявечнай гістарыяграфіі, у якім з вялікай стараннасцю сабраныя ўсе даступныя тады

Библиотека БГУИР

сведчанні пра мінулае Польшчы і акружаючых яе дзяржаў, у т.л. ВКЛ, і пакладзены пачатак яе сістэматызаванай гісторыі.

З замежных крыніц у даследаванні па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – першай паловы XVI ст. можа быць выкарыстана і лацінамоўная “Хроніка” Бернарда Вапоўскага, асабліва апошняя ее частка, што ахоплівае 1480 – 1535 гг. [7]. Гэта арыгінальная частка твора каштоўная цікавымі апісаннямі падзей, меўшых непасрэднае дачыненне да знешняй палітыкі ВКЛ. Сярод іх: войны з Вялікім Княствам Маскоўскім, мяцеж князя М.Л. Глінскага, супрацоўніцтва ліцвінскіх і польскіх ваяроў пры абароне паўднёвых межаў дзяржаў ад набегаў тарак і татараў і г.д. Храніст імкнуўся больш аб’ектыўна падыходзіць да паказу польска-ліцвінскіх узаемаадносін, зрабіў гэта ў больш цярпімым да ВКЛ, чым у Я. Длугаша, ключы. Па меркаванні даследчыкаў, такая трансфармацыя магла адбыцца пад уплывам ліцвінскіх арыстакратаў, якія з’явіліся пры двары караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра Ягайлавіча, і маглі прадэманстраваць храністу і ліцвінскае разуменне падзей.

Асаблівае значэнне для вывучэння пытанняў знешняй палітыкі ВКЛ мае “Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі” М. Стрыйкоўскага [8], упершыню выдадзеная ў Караляўцы (Кёніксбергу) у 1582 г. У многім каштоўнасць “Хронікі” ўзмацняецца тым, што аўтару ўдалося выкарыстаць многія мясцовыя крыніцы, у тым ліку тыя, што не дайшлі да нашага часу: беларуска-літоўскія летапісы, рукапісы і дакументальныя матэрыялы з архіваў Хадкевічаў, Алелькавічаў, Гедройцаў [9, с. 82 – 129].

У якасці крыніцы пры вывучэнні пытанняў знешняй палітыкі ВКЛ можа быць выкарыстаны твор мемуарнай літаратуры – успаміны аўстрыйскага дыпламата Сігізмунда Герберштэйна “Запіскі об Маскоўскіх справах” [10]. Аўтар – вопытны аўстрыйскі дыпламат, які больш за 50 год служыў імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі германскай нацыі з дынастыі Габсбургаў. Апошнія з’яўляліся канкурэнтамі прадстаўнікоў кіруючаў у той час у Польшчы і ВКЛ дынастыі Ягелонаў у барацьбе за троны Чэхіі і Венгрыі. Азначаныя акалічнасці прадвызначылі пэўную антыпольскую і антылітоўскую

Библиотека БГУИР

скіраванасць выкладання дыпламата. С. Герберштэйн двойчы – у 1517 і 1526 гг. – удзельнічаў у перамовах дарадчыкаў вялікага князя маскоўскага Васіля ІІІ і паслоў караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Казіміравіча. У нарысе, які прысвечаны гісторыі Маскоўскай дзяржавы, ён закрануў пытанне ўзаемаадносінаў Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ. Для “Запісак” характэрна імкненне ўзвялічыць Вялікае Княства Маскоўскае, даказаць беспадстаўнасць прэтэнзій ВКЛ на “рускія” землі. Акрамя таго, у працы змешчаны звесткі пра К.І. Астрожскага, дадзена падрабязнае апісанне падзей паўстання князя М.Л. Глінскага, маюцца звесткі пра асабісты лёс апошняга. Ёсць ва ўспамінах аўстрыйскага дыпламата і цэлая глава, якая прысвечана геаграфічна-гісторыка-эканамічнаму апісанню ВКЛ, якая так і называецца “Аб Літве” [10, с. 185 – 193]. Нягледзячы на палітычную тэндэнцыйнасць і пэўныя недакладнасці ў выкладанні матэрыялу, успаміны С. Герберштэйна – каштоўная гістрычная крыніца па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ першай паловы XVI ст.

На мяжы эпохі Сярэднявечча і Новага часу вялікае распаўсюджанне атрымаў такі від апавядальных крыніц, як трактаты. Цікавыя звесткі па знешнепалітычнай праблематыцы, асабліва што датычыць адносін ВКЛ з Вялікай і Перакопскай (Крымскай) ордамі, утрымліваюцца ў “Трактаце аб дзвюх Сарматыях” Мацея Мяхоўскага [11], які ўпершыню з’явіўся ў друку ў 1517 г. Сярод характэрных рыс названай крыніцы, як указвае А. Гейштар, можна назваць непасрэднае назіранне, як крыніцу геаграфічнага і этнаграфічнага апісання, прыцягненне сведчанняў па гісторыі нашэсцяў і перасяленнях народаў для тлумачэння актуальнага становішча рэчаў (не без памылак і промахаў), канцэнтрацыя ўвагі на дзвюх буйных дзяржавах – Асманскай імперыі і Вялікім Княстве Маскоўскім і г.д. [12, с. 32].

Трактат утрымлівае звесткі гісторыка-геаграфічнага характару. Ён дастаткова багаты і аб’ектыўна каштоўнымі сведчаннямі, нягледзячы на шэраг несумненна памылковых паведамленняў. М. Мяхоўскі расказвае не толькі пра

Бібліятэка БГУІР

мінулае, але часта і пра сучаснае для яго, вядомае з непасрэдных назіранняў. Гэтыя яго сведчанні асабліва цікавыя і каштоўныя, як першакрыніца.

Як крыніца ў даследаванні знешнепалітычнай праблематыкі гісторыі ВКЛ могуць быць выкарыстаны і 10 захаваўшыхся фрагментаў з трактата Міхалона Літвіна "Пра норавы татараў, літвінаў і маскавітаў" [13]. Доўгі час сапраўднае імя аўтара заставалася прадметам дыскусіі. У дарэвалюцыйнай расійскай, а потым і савецкай гістарыяграфіі аўтарства прыпісвалася Міхаілу Тышкевічу [14, с. 87 – 96]. Але ў 1970-я гг. польскі гісторык Ежы Ахманьскі на аснове комплекса прыкмет, што характарызавалі аўтара, а таксама сведчанняў іншых крыніц, пераканаўча даказаў, што аўтарам мог быць толькі Венцэслаў Мікалаевіч (1490 – 1560 гг.), літовец па паходжанні, католік па вераспавяданні, лацінскі сакратар велікакняжацкай канцылярыі ў 1534 – 1542, 1547 – 1555 гг., які неаднаразова выконваў дыпламатычныя даручэнні ў Крыме і Маскве [15, с. 97 – 117].

Трактат – палемічны твор і крыніца па гісторыі грамадскай думкі ВКЛ сярэдзіны XVI ст. Але ён утрымлівае звесткі і па ранейшых знешнепалітычных падзеях, дае іх ацэнку з пункту гледжання наступнага пакалення, па-свойму тлумачыць прычыны ваенных няўдач ВКЛ у стасунках з Вялікім Княствам Маскоўскім і крымскімі татарамі, характэрных для перыяду канца XV – першай паловы XVI ст. Трактат – своеасаблівая спроба ўздзейнічаць на манарха і грамадскае меркаванне ВКЛ, каб павысіць абароназдольнасць дзяржавы як з боку Крымкага ханства, так і з боку складваючайся Рускай дзяржавы. У цэлым твор з'яўляецца цікавай аўтэнтычнай крыніцай і асаблівую каштоўнасць мае пры вывучэнні гісторыі ўзаемаадносін ВКЛ Княства Літоўскага з Крымскім ханствам і некаторымі іншымі татарскімі ордамі.

Такім чынам, са сказанага вышэй можна зрабіць выснову, што пры распрацоўцы праблем знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст. ёсць магчымасць абаперціся на значны аб'ём разнастайных апавядальных крыніц, якія дазваляюць раскрыць змест і сутнасць асноўных кірункаў знешняй палітыкі ВКЛ і вызначыць сам механізм знешнепалітычнай дзейнасці.

Библиотека БГУИР

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Михайловская, Л. Л. Белоруссия и Литва конца XIV – первой трети XVI в. (по материалам хроники Бернарда Ваповского): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02/ Л. Л. Михайловская. – Минск, 1981. – 216 с.

2. Ходзін, С. Летапісанне на Беларусі/ С. Ходзін// Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 2. – С. 81 – 93.

3. Назаров, В. Д. Летописи белорусско-литовские/ В. Д. Назаров// Большая советская энциклопедия. – М.: Советская энциклопедия, 1973. – Т. 14. Куна – Ломами. – 624 с.: илл.

4. Чамярыцкі, В. Летапісы беларуска-літоўскія/ В. Чамярыцкі// Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя. У 2 т. – Мінск: БелЭн, 2006. – Т. 2. Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – 792 с.: іл.

5. Чамярыцкі, В. Летапісы беларускія/ В. Чамярыцкі// Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя. У 2 т. –Мінск: БелЭн, 2006. – Т. 2. Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – 792 с.: іл.

6. Семянчук, А. Длугаш Ян/ А. Семянчук// Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя. У 2 т. – Мінск: БелЭн, 2005. – Т. 1. Абаленскі – Кадэнцыя. – 688 с.: іл.

7. Wapowski, B. Kroniki Bernarda Wapowskiego z Radochoniec kantora katedr. krakowskiego. Cześć ostatnia czasy podługoszowskie obejmująnca (1480 – 1535)/ B. Wapowski// Scriptores rerum Polonikarum. – Kraków: druk. uniw. Jagiel., 1874. – T. II: Continet: Chronikorum Bernardi Vapovii partem posteriorem 1480 – 1535. – S. 1 – 256.

8. Stryjkowski, M. Kronika Polska, Litewska, Żmudzka i wszystkiej Rusi/ M. Stryjkowski. – Warszawa: Nakł. G.L. Glucksberga, 1846. – T. 1. – 440 s.; T. 2. – 572 s.

9. Улащик, Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания/ Н. Н. Улащик/ Отв. ред. В. И. Бутанов; АН СССР. Ин-т истории СССР. – М.: Наука, 1985. – 261 с.

Библиотека БГУИР

10. Герберштейн, С. Записки о Московии/ С. Герберштейн/ Пер. с нем. А. И. Малеина и А. В. Назаренко, вступ. статья А. Л. Хорошкевич, под ред. В. Л. Янина. – М.: Изд-во МГУ, 1988. – 430 с.

11. Меховский М. Трактат о двух Сарматиях/ М. Меховский/ Введение, перевод и коммент. С. А. Аннинского, вступ. статья Б. Грекова. – Л.: Тип-я им. Володарского, 1936. – X, 288 с.

12. Гейштор, А. История на службе юго-восточной политики Речи Посполитой в XV и XVI в./ А. Гейштор// Россия, Польша и Причерноморье в XV – XVIII вв./ Под ред. Б. А. Рыбакова. – М.: Наука, 1979. – С. 29 – 39.

13. Литвин, М. О нравах татар, литовцев и москвитян/ М. Литвин/ Пер. В. И. Мотузовой, вступ. статья М. В. Дмитриева, И. П. Старостиной, А. Л. Хорошкевич, коммент. С. В. Думина и др. – М.: Издательство МГУ, 1994. – 151 с.

14. Юргинис, Ю. М. Посольство Михаила Литвина у Крымского хана в 1538 – 1540 гг./ Ю. М. Юргинис// Россия, Польша и Причерноморье в XV – XVIII вв./ Под ред. Б. А. Рыбакова. – М.: Наука, 1979. – С. 87 – 96.

15. Охманьский, Е. Михалон Литвин и его трактат “О нравах татар, литовцев и москвитян” середины XVI в./ Е. Охманьский// Россия, Польша и Причерноморье в XV – XVIII вв./ Под ред. Б. А. Рыбакова. – М.: Наука, 1979. – С. 97 – 117.

Библиотека БГУИР